В.У.Азарка, А.С.Васілеўская (Мінск)

# ВОБРАЗ ГЕРОЯ – ВОБРАЗ АПАВЯДАЛЬНІКА – ВОБРАЗ АЎТАРА (НА МАТЭРЫЯЛЕ АПАВЯДАННЯ М.ГАРЭЦКАГА “РОДНАЕ КАРЭННЕ”)

У адпаведнасці з Канцэпцыяй вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура” ўрокі літаратуры павінны забяспечыць “фарміраванне ў вучняў сістэмы літаратурных (тэарэтыка-літаратурных і гісторыка-літаратурных) ведаў”, а таксама “выпрацоўку ўмення аналізу мастацкага тэксту ў аспекце творчай індывідуальнасці пісьменніка” [4]. Знаёмства з літаратуразнаўчымі паняццямі дапамагае навучэнцам глыбей пранікнуць у сутнасць літаратурнага тэксту, зразумець яго як твор мастацтва.

Для цэласнага разумення празаічнай літаратуры, фарміравання паняцця пра іх кампазіцыю важна выпрацаваць у навучэнцаў уменне размяжоўваць такія важныя паняцці, як вобраз героя, вобраз аўтара і вобраз апавядальніка. Дасягнуць гэтага можна толькі пры ўмове, што вучань дакладна разумее змест паняццяў, ведае, якімі моўнымі сродкамі ствараюцца гэтыя вобразы ў мастацкім тэксце.

Сярод акрэсленых паняццяў найбольш знаёмым для вучняў з’яўляецца, безумоўна, вобраз героя (персанаж), пад якім разумеюць галоўную дзеючую асобу літаратурнага твора. А вось паняцці вобраз апавядальніка і вобраз аўтара дастаткова часта не атрымліваюць свайго асвятлення ў школьным курсе літаратуры.

Вобраз апавядальніка выступае адным з самых важных элементаў кампазіцыі мастацкага твора, бо менавіта ад яго залежыць пабудова тэксту, суаднесенасць і размяшчэнне яго эпізодаў. Звычайна пад гэтым паняццем разумеюць суб’екта маўлення – умоўнага носьбіта аўтарскага (г.зн. не звязанага з маўленнем якога-небудзь персанажа) маўлення ў празаічным творы, ад імя якога вядзецца апавяданне. Апавядальнік можа быць як блізкім аўтару, так і, наадварот, вельмі далёкім ад яго па характары і грамадскім палажэнні, можа не толькі пераказваць гісторыю, але і адначасова быць удзельнікам падзей. Таму традыцыйна вылучаюць суб’ектыўны і аб’ектыўны метады апавядання: пры суб’ектыўным метадзе апавяданне вядзецца ад 1-й асобы, пры аб’ектыўным – ад 3-й [8, с. 83]. Аднак у любым выпадку вобраз апавядальніка – гэта, па словах В.У.Вінаградава, праява літаратурнага артыстызму пісьменніка. Атаясамліваць гэта паняцце з паняццем “вобраз аўтара”, як гэта зроблена ў “Слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў” [5, с. 35-36], неправамерна.

В.У.Вінаградаў падкрэсліваў, што вобраз аўтара ёсць у мастацкім творы заўсёды, і гэта не асоба рэальнага пісьменніка, а яго своеасаблівы «актерский лик»; вобраз аўтара рэканструіруецца на аснове твораў, а не біяграфічных звестак, вывучаць гэты вобраз можна як з пазіцый літаратуразнаўства і эстэтыкі, так і з пазіцый мовы і стылістыкі мастацкага твора [3].

Паглыбленне ўяўлення вучняў X класа пра вобраз апавядальніка, згодна з вучэбнай праграмай, павінна адбывацца на прыкладзе твораў Максіма Гарэцкага – апавяданняў “Літоўскі хутарок” (базавы ўзровень), “Роднае карэнне”, аповесцей “Дзве душы” (павышаны ўзровень), “На імперыялістычнай вайне” (спіс для дадатковага чытання).

Выбар твораў для аналізу невыпадковы. Як адзначаюць даследчыкі, Максім Гарэцкі быў адным з тых, “чыёй працай у апошняе перадрэвалюцыйнае дзесяцігоддзе закладваўся падмурак мастацкай прозы, выпрацоўвалася яе сацыяльная і эстэтычная праграма адносін да жыцця, канцэпцыя чалавека і асноўныя прынцыпы яго паказу ў творах” [6, с. 95]. Менавіта ў гэты час беларуская проза становіцца сапраўды мастацкай, паколькі ў апавяданне пранікае сацыяльны і псіхалагічны аналіз, з’яўляюцца мастацкія характары, якія вядуць за сабой аўтара. Акрамя таго, Максім Гарэцкі ўвёў у нацыянальную прозу новага героя – вясковага інтэлігента, які ўсведамляе дваістасць уласнага становішча “прымака ў панстве” і “пасынка вёскі”, – і “фактычна тут была зроблена канцэптуальная заяўка на тэму “дзвюх душ” [7, с.382].

У прозе пачатку XX стагодзя пераважаў аб’ектыўны метад апавядання. Максім Гарэцкі імкнуўся да максімальнага раскрыцця “душы” персанажа, шукаў спосабы перадачы падзей вачыма герояў, акцэнтаваў увагу на іх думках, перажываннях. “Арыентацыя на пункт гледжання персанажа мяняе кампазіцыйную структуру твораў, робіць іх канструктыўна шматпланавымі. Значна пашыраецца выкарыстанне няўласна-простай мовы, прычым функцыі яе ўзбагачаюцца” [8, с. 84]. Па сутнасці, Максім Гарэцкі з’яўляецца адным з першых, хто стаў выкарыстоўваць прыём суб’ектывацыі апавядання ад 3-й асобы.

Апавяданне “Літоўскі хутарок” – з’яўляецца выдатным прыкладам таго, як даследаванне хранатопу, увага да змены пазіцый, з якіх вядзецца аповед, аналіз розных пунктаў гледжання садзейнічае раскрыццю ідэі мастацкага твора [1].

Апавяданне “Роднае карэнне” пабудавана па-іншаму: аб’ектыўнае апавяданнне ад 3-й асобы увесь час перарываецца нявыказанай простай мовай і няўласна-простай мовай, што дае магчымасць пранікнуць у псіхалогію галоўнага героя.

Галоўны герой апавядання – студэнт-медык Архіп Лінкевіч, вясковы інтэлігент, інтэлігент у першым пакаленні, які ўсведамляе сваю адказнасць за лёс блізкіх, народа, роднага краю. Гэта тыповы герой для твораў М.Гарэцкага, герой, які пастаянна ў роздуме, пастаянна ў пошуку, у якім выразна выяўляюцца “дзве душы”.

Вобраз героя мастацкага твора складваецца з яго дзеянняў, учынкаў і перажыванняў, мовы, аўтарскай характарыстыкі і характарыстык іншых персанажаў. Выбар мастацкіх сродкаў для стварэння гэтай характарыстыкі дазваляе ўвасобіць ідэю “дзвюх душ” у апавяданні “Роднае карэнне”.

Для намінацыі героя пісьменнік выкарыстоўвае назоўнікі ***студэнт***, ***медык***, якія падкрэсліваюць яго статус як чалавека навукі. Аднак перад намі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

не бяздушны сухі будучы вучоны. Перад намі чалавек, здольны убачыць прыгажосць у навакольным, што і падкрэслена перыфразай ***ласун да красы***.

У дзейнасці Архіпа таксама выразна прасочваецца дваістаць яго душы. З аднаго боку, перад намі выхадзец з вёскі, які не забыўся і не цураецца сялянскай працы: *Радавалася сэрца старога бацькі яго, як пойдуць на сенакос яны: хлапец-работнік Восіп, сын і сам стары Нупрэй… Скіне студэнт і брыль з галавы, і расшпіліцца, і распяражацца, хоча плячо ў плячо з работнікам харошым ісці* [2, с. 71]. З другога боку, галоўны герой ужо адышоў ад гэтага асяроддзя: ён цікавіцца гісторыяй і літаратурай, разважае на складанымі філасофскімі пытаннямі, але ўхіляецца ад рэальных праблем, не ўмешваецца ў абмеркаванне вясковых спраў: *Як агню, баяўся такіх гутарак Архіп і жыў у бацькоў ціха, смірна, у гаворкі вялікія не лезучы* [2, с. 71].

Найбольшая ўвага ў тэксце скіравана на духоўнае жыццё галоўнага героя. Для гэтага М.Гарэцкі выкарыстоўвае некалькі прыёмаў: апісанне ўнутранага стану, выкарыстанне няўласна-простай і нявыказанай простай мовы. У апавяданні ўжываецца вялікая колькасць лексем, якія дазваляюць перадаць самыя тонкія адценні настрою. Так, ліст ад бацькі, які расказвае пра незвычайныя здарэнні ў новай хаце, выклікае ў Архіпа цэлую гаму пачуццяў: ***зацікаўлены, задумаўся аб родным сяле, думаў-сумаваў, было трохі смешна, злосна смяяўся, затужыў троху***. Успаміны пра вёску выклікаюць ў яго замілаванне, аднак старыя вераванні, што пануюць у вёсцы, замшэласць мыслення нараджаюць злосць і сум: *Як многа слаўнага ў нашых вёсках, сёлах, а тым часам як яны непарушна-мёртвыя ў жыцці. Час ідзе – угары, у воздусі лётаюць аэрапланы, дырыжаблі; пад вадой жывуць людзі, як на зямлі; перагаварываюцца на тысячы вёрст; даходзяць да таго, што думаюць замаражываць чалавека на колькі трэба часу і ўзноў аджыўляць яго; усё ідзе шпарка ўперад, толькі нашу вёску, як абросшы мохам камень каля шляху, з мясціны не скранеш. Сумна, сумна* [2, с. 59].

З радасцю збіраецца студэнт паехаць да бацькоў, каб разабрацца з чартаўшчынай у новай хаце. Жыццё ў роднай вёсцы нясе на некаторы час супакаенне і гармонію: *Люба тут! Люба жыць сярод працы, свяцейшай усіх прац, – працы земляроба. Люба мець здаровае цела і здаровы дух…* [2, с. 72]. Аднак перад намі ўжо не такі апалагет навукі, якім паўставаў Архіп у пачатку твора. З'яўляюцца ў яго галаве *пытанні шалёныя*, і Архіп не хавае свайго пэўнага расчаравання: *І Архіп успомніў, як ён з вялікім жарам і шчырай ахвотай пачынаў вучыцца, бо думаў, ды што думаў – крэпка верыў, што ў кніжках усё ёсць, кніжкі ўсё раскажуць, не толькі як яно, але і адкуль яно. І вось ён "укусіў" ад кніжнае мудрасці… Папраўдзе, знайшоў такія і гэтакія адказы, але ж божа! – пэўнасці ніякай няма, няма* [2, с. 66].

Таму і пакідае герой родную вёску, адчуваючы адначасова палёгку (*Мне так люба, лягчэй мне*), крыўду (*А ўсё ж крыўдна, дзядуля, што людзі сляпыя такія*) і маркоту (*"І трыста, чатырыста гадоў назад таксама дуў ён тут, ветрык, і таксама калыхаў-цалаваў траўку, сумную і маўклівую…*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*толькі цуда-машыны не было”, – памысліў студэнт і замаркоціўся* [2, с. 79-80]*)*.

Сродкаў для раскрыцця вобразу апавядальніка ў апавяданні значна менш. Апавяданне вядзецца ад 3-й асобы, якая ў творы не названа. Меркаваць пра суб’ект аповеду мы можам толькі абапіраючыся на аўтарскае маўленне, на выбар тэмы і эпізодаў, галоўных і другасных персанажаў, апісанне прыроды.

Можна меркаваць, што герой апавядання блізкі апавядальніку, якога хвалюе разлад у душы Архіпа Лінкевіча. Нездарма менавіта на галоўнага героя скіравана ўвага.

Апавядальнік таксама ўмее бачыць прыгожае ў штодзённым: чаго вартыя яркія апісанні раніцы ў бацькоўскай хаце, сенакосу, пейзажныя замалёўкі, у якіх ён не шкадуе вобразных сродкаў: *Наўкруг было так ціхамірна і так па-нябеснаму святочна і прыгожа* [2, с. 61]; *Сонейка гуляла снапамі святла па настольніку і па старэнькіх абразах* [2, с. 64]; *Скакунцы – стрык-стрык-цырр… – песеньку пяюць* [2, с. 71].

Апавядальніка таксама хвалюе тое невядомае, што палохае людзей. Ён па-майстэрску стварае атмасферу трывогі і страху перад незразумелым: *Сухое дрэва страшна і балюча скрыпала, быццам выказвала бяду, і гора, і ўсякае ліха* [2, с. 67]

Апавядальнік таксама шукае адказ на пытанне, якое задае Архіп Лінкевіч: *Што за народ наш такі, беларусы?* І, у адрозненне ад свайго героя, апавядальнік не можа заставацца ў баку ад праблем сялян. Ён дае выказацца гэтым персанажам на старонках твора, ствараючы своеасаблівы хор, дзе кожны голас гучыць вельмі выразна. Напрыклад, пры апісанні пажару:

*– Пажар! Пажар! Ратуйця! – крычаў ужо нехта на сяле. Заварушыліся людзі, збягаюцца.*

*– Дзе, хто гарыць?*

*– Новая хата ў Лінкевічаў.*

*– Ці там?*

*– Няго ж – не вун, ай-ай…*

*– Падзівуйся, во шугаець, і помачы не дасі.*

*– Якая тут помач: пярун чорта забіў.*

*– А маўчы жы ты, ай сказіўся? Проці ночы…*

*– Добра, што воддаль двароў пабудавалі: на сяло не перакінецца.*

*– А не, няхай бог крыець* [2, с. 69-70].

Спыняючы погляд на розных прадстаўніках народа, апавядальнік дае свой адказ: народ – гэта і дзед Міхалка, “*што да смерці заўсёды крэпка маліўся богу і тым часам лашчыў, як можна, дамавых, лесавых, вадзяных”,* і балагольшчык, які верыць у старыя паданні, і сяляне, якія вучаць Архіпа жыццю, і дзед Яхім з яго жыццёвым вопытам і народнай мудрасцю. Нездарма менавіта ў вусны дзеда Яхіма ўкладваюцца словы, якія выражаюць ідэю апавядання: *Першае, што скажу я табе, гэта – чытай, галубец, у кніжках і ў разумных людзей пытайся, як жылі даўней нашы тутэйшыя людзі… А другое: часцей у роднае гняздзечка залятай ды не будзе яно*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*здавацца табе страшным… …не забывайся ты запытаць у сябе: “А можа, цяпер у каго скарынкі хлеба няма?” І ведай тады, што адным енкам ды стагнаннем бядзе людской не паможаш…”* [2, с. 79].

Гаварыць жа пра вобраз аўтара ў апавяданні можна толькі з улікам шэрагу твораў, напісаных Максімам Гарэцкім у апошняе перадрэвалюцыйнае дзесяцігодзе. Героямі гэтых апавяданняў з’яўляецца інтэлігент, выхадзец з народа: акрамя Архіпа Лінкевіча, гэта і навучэнец каморніцкага вучылішча Клім Шамоўскі (апавяданне “У лазні”), і Кастусь Зарэмба (апавяданне “У чым яго крыўда?”), і Уладзімір З. (апавяданне “Рунь”), і Лявон Задума (аповесць “Меланхолія”). Канфлікт у гэтых творах найчасцей абумоўлены сутыкненнем светапогляду юнака-рамантыка з замшэлым вясковым асяроддзем. Гэты канфлікт часам настолькі востры, што нават родныя бацькі не разумеюць высакародных памкненняў і глядзяць на сваіх дзяцей “як на пана” (Клім Шамоўскі”), або як на “кандыдата ў немалыя паны” (Кастусь Зарэмба). Як адзначае І.П.Чыгрын, сутнасць гэтага канфлікту “ў адметнасці беларускага адраджэння, якое расцягнулася на стагоддзі, нязменна забіваючы веру ў саму яго перспектыўнасць. І не толькі ў тых, каго трэба было весці за сабою, але і ў тых, хто павінен быў весці, хоць апошнія нярэдка ў гэтым не прызнаваліся. У выніку – асуджанасць на адзіноту, незадаволенасць усім існым, адчай, а то і думкі пра смерць. схільнасць да блазенскіх учынкаў, шараханне з аднаго боку ў другі” [9, с. 41].

Сам выхадзец з вясковага асяроддзя, Максім Гарэцкі ніколі не ідэалізаваў тагачасную вёску і яе жыхароў, іх неадукаванасць, п’янства, апатыю. Але разам з тым ён гаварыў і пра сувязь, якую яго героі, вясковыя інтэлігенты, павінны захаваць з роднай вёскай і сваім народам. Невыпадкова апавяданне называецца “Роднае карэнне”: слова ***корань*** (‘падземная частка расліны, пры дапамозе якой яна замацоўваецца ў зямлі і атрымлівае пажыўныя рэчывы’) у гэтай назве ўжываецца з пераносным значэннем – ‘аснова чаго-небудзь’. Важна, на наш погляд і тое, што ў жыцці галоўнага героя гэтага апавядання драма толькі намячаецца. Стары Яхім здолеў растлумачыць, што выклікае сум-маркоту ў юнака: *Гэта ў пары такой цяпер ты! А шчэ горш тое – рос ты змалку сярод нас, цёмных, у лесе, дзе яшчэ мой дзед маліўся каля асінавага пня богу Дуплінскаму-Ільінскаму. Вось яно і гаворыць у табе. Нічога, прывыкнеш сярод паноў – абойдзецца…* [2, с. 79]. Чытачу застаецца надзея, што Архіп Ліневіч здолее пазбегнуць жыццёвай драмы, калі выканае наказы дзеда Яхіма.

Такім чынам, засвоіўшы сутнасць паняццяў вобраз героя, вобраз апавядальніка, вобраз аўтара, навучыўшыся іх размяжоўваць, абапіраючыся на маўленчыя сродкі, вучні Х класа змогуць не толькі глыбей спасцігнуць ідэю “Роднага карэння”, але і зразумеюць месца гэтага апавядання ў кантэксце іншых твораў Максіма Гарэцкага, рэкамендаваных для вывучэння на ўроках беларускай літаратуры.

Спіс літаратуры

1. Азарка, В. У. Роля хранатопу ў раскрыцці ідэі апавядання “Літоўскі хутарок” / В. У. Азарка, А. С. Васілеўская // Першая сусветная

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вайна ў народнай памяці і мастацкім адлюстраванні : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 7–8 кастр. 2014 г. / А. І. Лакотка (нав. рэд.). – Мінск : Права і эканоміка, 2014. – С. 166–170.

2. Гарэцкі, М. Роднае карэнне / М. Гарэцкі // Збор твораў : у 4 т. – Мінск : Маст. літ., 1984. – Т. 1 : Апавяданні. – С. 58–80.

3. Горшков, А. И. Образ автора – организующее начало текста. Учение В.В.Виноградова об образе автора [Электронный ресурс] / А. И. Горшков // Горшков, А. И. Русская стилистика. Стилистика текста и функциональная стилистика : учебное пособие. – Москва : АСТ, Астрель, 2006. – Режим доступа: http://nashol.com/2011032553968/russkaya-stilistika-stilistika-teksta-i-funkcionalnaya-stilistika-gorshkov-a-i.html. – Дата доступа: 01.03.2018.

4. Канцэпцыя вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура", зацверджаная Загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 29.05.2009 № 675 [Электронны ресурс] // Нацыянальны адукацыйны партал. – Рэжым доступу: adu.by/wp-content/uploads/2014/umodos/kup/Koncept_Bel_lit. – Дата доступу: 01.03.2018.

5. Лазарук, М. А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Народная асвета, 1996. – 176 с.

6. Матрунёнак, А. П. Псіхалагічная проза: Традыцыі і час / А. П. Матрунёнак. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 205 с.

7. Мушынскі, М. І. Максім Гарэцкі / М. І. Мушынскі // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я.Купалы. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2001. – Т.1. – С. 381–426.

8. Цікоцкі, М. Я. Стылістыка тэксту / М. Я. Цікоцкі. – Мінск : Бел. навука, 2002. – 223 с.

9. Чыгрын, І. П. Паміж былым і будучым: Проза Максіма Гарэцкага / І. П. Чыгрын. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 168 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ